Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-09-21

# Ці толькі асабістае?

Арцём КУМЕЛЬСКІХ

Праз 10 гадоў пасля выхаду кнігі Арыядны Ладыгінай "Ларыса Пампееўна Александроўская: дакументальна-тэатральны раман" выдавецтва "Чатыры чвэрці" выпусціла яе мемуарна-публіцыстычныя нататкі "Ад скрыпкі да эстэтыкі: старонкі жыцця". Новае выданне выкліча цікавасць і сярод прафесійных музыкантаў, і ў шырокім коле чытачоў-гуманітарыяў. Перадусім звяртае на сябе ўвагу знакавае для айчыннай культуры імя аўтара — вучонага, педагога, чыя ўнікальная эрудыцыя аб'ядноўвае глыбокі досвед у сферы музычнага мастацтва і грунтоўнае спасціжэнне філасофіі. З імем А. Ладыгінай звязваюць заснаванне і развіццё ў беларускай навуцы галіны музычнай эстэтыкі. У Акадэміі навук БССР ёй давялося быць першым кіраўніком аддзела музычнага мастацтва. У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер акадэмія музыкі) яна стварыла кафедру філасофіі. Напісала нямала фундаментальных прац, прысвечаных агульначалавечай духоўна-эстэтычнай праблематыцы, манаграфій пра з'явы беларускага мастацтва.

Ва ўводзінах да новай кнігі А. Ладыгіна тлумачыць сваё імкненне разабрацца ва ўласным жыцці, асабістых уражаннях, асэнсаваць пройдзены ёю доўгі шлях у музычным асяроддзі, беларускай навуцы, мастацтве. І прызнаецца, што паўвекавая праца ў кансерваторыі, стварэнне ўнікальнай кафедры, само выкладанне эстэтыкі, напісанне манаграфій, праца як музычна-тэатральнага крытыка, заняткі на скрыпцы — усё для яе аднолькава важнае, ні ад чаго не адмовілася б і сёння. Аўтар падкрэслівае: дзённікаў яна не вяла; збіраючы ў адно выключна асабістыя ўражанні, назіранні, высновы, амаль не карысталася дакументальнымі, даведачнымі матэрыяламі, даверыўшыся памяці. А ў памяці жыве не толькі асабістае.

Арцём Кумельскіх. Ці толькі асабістае?